ды» (1918), «Скарынін сын з Полацка» (паст. 1926, рукапіс не знойдзены), «Каля тэрасы» (паст. 1927, выд. 1929), «Над Нёманам» (паст. 1927), камедыі «Віно бушуе» (1929), зб-каў вершаў «Плынь» і «Дзве паэмы» (абодва 1927), успамінаў пра Я.Купалу, Я.Коласа, А.Грыневіча. Творчасць Г. прасякнута верай у чалавека, у сілу яго розуму і неабмежаваныя магчымасці пазнання ім прыроды. У вершах шырока выкарыстоўваў навук. і тэхн. тэрміналогію. Выдаў падручнікі «Пачатковая геаграфія» (1923) і «Уводзіны ў навуку аб неарганічнай прыродзе» (ч. 1—2, 1926). У 1930 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.

*Тв.:* Выбранае. Мінск, 1967; Родная пушча: п'есы, вершы, паэмы, успаміны, лісты. Мінск, 1987.

**ГРАН ПА** (франц. grand pas літар. вял. крок, вял. танец), складаная шматчасткавая танцавальна-музычная форма. Узнікла ў эпоху Рамантызму і атрымала завяршэнне ў творчасці рус. балетмайстра М.Петыпа. Будуецца як санатная форма ў музыцы: экспазіцыя, адажыа і варыяцыі (распрацоўка), затым кода. У Г.п. харэаграфія абагульнена-паэтычна выяўляе ўнутр. змест балета. Танц. тэмы сімфанічна развіваюцца, пераплятаюцца, проціборствуюць. Такія Г.п. ёсць у балетах «Баядэрка» Л.Мінкуса, «Раймонда» А.Глазунова і інш. Выконваецца сумесна салістамі, карыфеямі, кардэбалетам. Некат. Г.п. маюць дзейсны характар. У Дзярж. тэатры оперы і балета Беларусі паст. аднаактовы спектакль «Вялікае класічнае па» на муз. Л.Мінкуса з балета «Пахіта» Э.Дэльдэвеза («У гонар Марыуса Петыпа», 1981).

**ГРАНА́Я НЯДЗЕ́ЛЯ**, Граны тыдзень, Праводны тыдзень, Русальны тыдзень, наступны тыдзень пасля Сёмухі (Тройцы) — дні завяршэння веснавой абраднасці. Г.н. ўключае пераход ад вясны да лета, які вызначаецца амбівалентнасцю: як росквітам і прыгажосцю, так і буянствам варожых сіл, што шкодзяць чалавеку ў справах, прыносяць хваробы, засуху, град і інш. Свята звязана з павер'ямі пра русалак. У іх сімволіцы адбіліся язычніцкія і хрысціянскія погляды, у выніку чаго яны атрымалі дэманалагічныя і маністычныя абрысы. У цэнтры Г.н. — культ расліннасці і ўшанавання продкаў (Наўская Тройца). Існуе меркаванне, што ў глыбокай старажытнасці русалка сімвалізавала бажаство пладаноснай зямлі, была апекуном ураджаю, існавала як сезонны каляндарны дух прыроды. Адносіны да яе ў свядомасці народа пераасэнсоўваліся і з цягам часу набылі сакральна-негатыўную семантыку. Сакральныя магічныя ўласцівасці русалкі вызначаюцца прыналежнасцю да нячыстай сілы, паколькі яна як нехрышчоная памерла ненатуральнай смерцю. Завяршалася Г.н. абрадам Провадаў русалкі ў іншасвет. У наш час абрад ператварыўся ў гульню.

*А.М.Аляхновіч.*

**ГРАНЕ́ННЕ**, тэхніка апрацоўкі паверхні прыродных і сінтэтычных мінералаў — самацветаў, каляровага і бясколернага шкла, крышталю для ювелірных і тэхн. мэт, хрустальнага посуду. Апрацоўка самацветаў для ювелірных вырабаў, культавых рэчаў вядома з 3-га тыс. да н.э. (Стараж. Егіпет), з 8—7 ст. да н.э. — у Індыі і інш. Гранільны станок вынайдзены ў Галандыі ў 1456. У Беларусі Г. шкла і прывазнога хрусталю вядома з 18 ст. на шкляных мануфактурах ва Урэччы (Любанскі р-н), Налібаках (Стаўбцоўскі р-н), у в. Ілья (Вілейскі р-н), у Гродне на мануфактуры шкляных пацерак. Апрацоўваліся люстэркі, асвятляльная арматура, шклянкі, бакалы, пляшкі, штофы і інш. Вядомы розныя тыпы Г.: «ружай» (ад 12 да 72 граняў), «паўбрыльянтавае» (ад 12 да 32), «брыльянтавае» (ад 48 да 240), «ступеньчатае», «клінамі», «мешанае», «кабашонам» (гладкае шліфаванне) і інш. У наш час на заводах Беларусі часцей ужываецца Г. «шырокая грань» і «алмазнае». Сярод інструментаў Г.: зробленыя з алмазных парашкоў шліфавальныя кругі, хоны, брускі, пілкі і разцы, свердзелы, шкларэзы, долаты, брускі, правільныя алоўкі, ролікі фасонныя, шматручаёвыя і інш. з алмазных крышталёў.

*Да арт. Граненне. А.А т р а ш к е в і ч. Вазы дэсертныя. 2006.*



*Літ.:* Я н і ц к а я М. Беларускае мастацкае шкло (16—18 стст.). Мінск, 1977.

*Л.Ф.Салавей.*

**ГРА́НІЧЫ**, вёска ў Маладзечанскім р-не. За 26 км на ПдУ ад г. Маладзечна, 11 км ад чыг. ст. Уша на лініі Маладзечна—Мінск, 50 км ад Мінска, каля аўтадарогі Маладзечна—Радашковічы. Цэнтр Граніцкага с/с. 140 гаспадарак, 398 ж. (2011).

Вядомы з 16 ст. як сяло ў Мінскім ваяв. ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Вілейскім павеце Мінскай губ. У 1897—34 двары, 209 ж. З 1919 у БССР. З 1921 у складзе Польшчы, вёска ў Красненскай гміне Вілейскага павета Віленскага ваяв. З 1939 зноў у БССР. З 12.10.1940 цэнтр сельсавета Радашковіцкага р-на Вілейскай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да пач. ліп 1944 Г. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 у Маладзечанскай вобл. З 16.7.1954 да 1.10.1973 у Сычавіцкім с/с. З 20.1.1960 у Маладзечанскім р-не Мінскай вобл. У 1969 — 103 гаспадаркі, 390 ж. У 1997 — 116 гаспадарак, 327 ж.

У 2011 сярэдняя школа, б-ка, ФАП, аддз сувязі, магазін. Брацкая магіла чырвонаармейцаў, якія загінулі ў польск.-сав. вайну 1919—20, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.